


ДУК «Астравецкая раённая бібліятэка»

Адрас:
г. Астравец
пр-т Энергетыкаў, 2

Тэлефон: 8-01591-79-2-90
Эл. пошта: ostrov_bibl@mail.ru

Аддзел маркетынгу і сацыякультурнай дзейнасці

Серыя "Іх імёнамі названы вуліцы Астраўца"

# Кастусь Каліноўскі



Астравец, 2022



Кастусь Каліноўскі (Вікенцій Канстанцін Сямёнавіч Калінóўскі)  2.02.1838 – 22.03.1864г. — рэвалюцыйны дэмакрат, публіцыст, паэт, адзін з кіраўнікоў паўстання на тэрыторыі сучасных Беларусі і Літвы.

Продкі Каліноўскага на працягу амаль ста гадоў валодалі маёнткам Калінова на памежжы Беларусі і Польшчы, якое пазней было прададзена. Бацька, Сямён Каліноўскі, быў беззямельным шляхціцам з Гродна, уладальнікам ткацкай мануфактуры. Маці — Вераніка Рыбінская, памерла, калі Кастусю было 5 гадоў. Кастусь нарадзіўся ў маёнтку Мастаўляны (зараз вёска ў Гродзенскім раёне) Гродзенскай губерніі, Расійскай імперыі

Закончыў Свіслацкую гімназію, юрыдычны факультэт Пецярбургскага ўніверсітэта. Актыўна ўдзельнічаў у дзейнасці рэвалюцыйных гурткоў. Светапогляд Каліноўскага фарміраваўся пры нарастанні сялянскага руху, пад уплывам ідэй рускіх радыкальна настроеных публіцыстаў Н.Г.Чарнышэўскага, А.І.Герцэна і традыцый польскага нацыянальна-вызваленчага руху.

У 161г. Каліноўскі сумесна з Урублеўскім стварылі рэвалюцыйныя гурткі ў Гродзенскай і Віленскай губерніях, якія ўвайшлі ў адзіную канспіратыўную арганізацыю. У 1862-1863 гг. кіраваў выданнем і распаўсюджваннем «Мужыцкай праўды» — першай нелегальнай рэвалюцыйнай газеты на беларускай мове.

Каліноўскі заклікаў да барацьбы сялян, прытрымліваўся ідэі распаўсюджвання паўстання на Усход і на Поўнач ад граніц Паўночна-Заходняга краю. Узначаліў у 1863 паўстанне ў Беларусі і Літве. Ва ўмовах жорсткіх дзеянняў урадавых сіл, знаходзячыся ў глыбокім подполлі, Каліноўскі кіраваў паўстанцамі да свайго арышту ў канцы студзеня 1864 года.

Прыгавораны да смерці, К. Каліноўскі працягваў барацьбу, звяртаючыся да народа з «Пісьмамі з-пад шыбеніцы». З пісем вынікала, што Каліноўскі не прызнаваў расійскую ці польскую ўладу сваімі для беларусаў. Ён прызываў беларускі народ ваяваць «за свайго Бога, за сваё правы, … за сваю Радзіму».

Пакараны праз павешанне ў Вільні на Лукішскай плошчы.

# У памяць аб К.Каліноўскім

У 1943г. у гонар Кастуся Каліноўскага была названа савецкая партызанская брыгада, якая з'яўлялася адным з найбольш актыўных аб'яднанняў у ваколіцах Гродна і Беластока.

У 1963 годзе ў г. Мінску імем К.Каліноўскага названы вуліцы ў мікрараёнах Усход і Зялёны Луг.

Імя К.Каліноўскага было дадзена Свіслацкай СШ № 1 (зараз ДУА «Гімназія № 1 ім. К. Каліноўскага г. Свіслач»).

В 1993г. была выпушчана паштовая марка Беларусі, прысвечаная Каліноўскаму.

